**УДК 39:581.9(476.5)**

# ПЕРСПЕКТЫВЫ СУЧАСНАГА ВЫКАРЫСТАННЯ ДЗІКАРОСЛЫХ РАСЛІН БЕЛАРУСАМІ ПАДЗВІННЯ ЯК СРОДАК УМАЦАВАННЯ ЭКАЛАГІЧНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ

***Я.С. Шаўчэнка***
Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Мінск, Рэспубліка Беларусь

*Дзікарослыя расліны здаўна выконвалі важную ролю ў штодзённым жыцці, рытуалах і абрадах беларусаў, у тым ліку і на тэрыторыі Падзвіння. Існуючыя традыцыі выкарыстання дзікарослых раслін з'яўляліся сведчаннем надзвычай высокай экалагічнай свядомасці беларусаў. Сучаснае поле ўжытку дзікаролых раслін на Падзвінні працягвае заставацца даволі шырокім і, адпаведна, значна акцэнтуе ўвагу на неабходнасці рацыянальнага прыродакарыстання, з захаваннем усіх унікальных традыцый, уласцівых дадзенаму гісторыка-этнаграфічнаму рэгіёну. На падставе матэрыялаў палявых даследаванняў аўтара і апублікаваных навуковых крыніц характарызуюцца перспектывы сучаснага выкарыстання дзікарослых раслін беларусамі Падзвіння, як сродак умацавання экалагічнай самасвядомасці і папулярызацыі дадзенай культурнай традыцыі.*

***Ключавыя словы:*** *дзікарослыя расліны, гісторыка-этнаграфічны рэгіён Падзвінне, рацыянальнае прыродакарыстанне, экалагічная самасвядомасць.*

На складванне традыцый выкарыстання беларусамі Падзвіння дзікарослых раслін, безумоўна, у першую чаргу паўплываў прыродна-кліматычны фактар. Тэрыторыя рэгіёну характарызуецца панаваннем больш суровага клімату ў параўнанні з паўднёвымі абласцямі Беларусі, з чаго вынікае відавая спецыфіка расліннага свету паўночнай Беларусі, з перавагай іглічных відаў расліннасці над лісцянымі. У межах агульнабеларускай традыцыі, на Падзвінні з даўніх часоў важным аспектам узаемадачыненняў "прырода-чалавек" стае неабходнасць рацыянальнага прыродакарыстання, а таксама высокі ўзровень *экалагічнай самасвядомасці*. Пад апошнім варта разумець заснаванае на рацыянальных ведах і экалагічных паводзінах адказнае стаўленне чалавека да ўзаемаадносінаў з навакольным светам прыроды.

Чалавек традыцыйнага грамадства разглядаў лес не толькі з прагматычнага боку як месца, куды можна схадзіць па грыбы, ў ягады альбо на паляванне, але яшчэ як сакральны рэгіён, месца першаснай прыроды, некранутай чалавекам, дзе акрамя раслін і жывёл існуюць і прадстаўнікі іншасвету. І таму нездарма наведванне чалавекам лесу насіла не проста выпадковы характар, а падпарадкоўвалася цэламу шэрагу прадпісанняў і ўяўленняў аб правілах паводзінаў, якія спрадвеку фігуравалі ў межах традыцыйнай культуры беларусаў. Сімвалічныя прадпісанні паводзінаў чалавека ў лесе павінныя былі забяспечыць правільны кантакт прыроды і чалавека і прадухіліць небяспеку ў дачыненні да апошняга.

Вялікае значэнне надавалася таму, як чалавек уваходзіць у лес. У лес патрэбна было заходзіць з добрым настроем, з павагай. Мог мець месца і падарунак для "ляснога хазяіна", якому звычайна кланяліся пры ўваходзе. Падарункам звычайна выступаў хлеб з соллю: "…А лесу часному і лясному хазяіну паклон аддаваў і падаркам яго надзяляў: хлебам да соллю, да каленкораву рубаху, да шаўковую падпаяску" , або "…Іду ў лес, бяру хлеб і соль і нясу лясному хазяіну". Падобныя светапоглядныя ўяўленні маюць месца сярод старэйшага пакалення жыхароў Падзвіння і па сённяшні дзень: "Лесавик. Он на каждом пню сидит. Он смотрит на всех. Он очень умный… Я всегда хлеб беру… Я когда выхожу из леса. На пень положу – и ухожу [1]. Тым не менш, сярод сучаснай моладзі дадзеная традыцыя ўжо не фіксуецца, абмяжоўваючыся агульнымі ведамі пра неабходнасць паважлівага стаўлення да лесу і лясных багаццяў.

Важнай часткай экалагічнай свядомасці беларусаў з'яўляліся правілы, якія рэгламентавалі збор розных відаў дзікарослых раслін. Беларуская традыцыя збору налічвае каля 300 відаў раслін, якія выкарыстоўвалі для розных патрэбаў, у тым лікук лячэння шматлікіх хвароб. Вялікая ўвага ў народнай традыцыі надавалася часу, калі варта было назапашваць расліны. Збіралі лекавыя расліны звычайна па часе іх выспявання ў залежнасці ад канкрэтнага віду, у сухое надвор'е. Агульнараспаўсюджаным з'яўлялася ўяўленне пра тое, што самыя моцныя травы збіраюць у купальскую ноч. Уяўленні пра магічныя ўласцівасці раслін, сабраных у гэту ноч, мелі пад сабой рацыянальную аснову. Па адзначэнні Л. Мінько, расліны, сабраныя ў перыяд квецені апоўдні, калі няма вільгаці, захоўваюцца лепш. Расліны, што збіралі пасля дажджу або расы хутка псуюцца і чарнеюць. Аднак, лакальныя традыцыі збору траў на Падзвінні адрозніваліся ў сваімі спецыфічнымі рысамі. Так, напрыклад, на Полаччыне зёлкі стараліся сабраць да свята Купалля, каб яны "не згубілі сваю моц", а ва Ушацкім і Лепельскім раёнах найбольшую моц прыпісвалі раслінам, сабраным ў маі, перад самай поўняй. [2]. Час збору мог вар'іравацца ў межах сутак, часта ён не быў прывязаны да нейкай канкрэтнай кропкі: "Абы як, абы калі. Вечарам врэмя больш, дык вечарам". [3].Некаторыя расліны маглі нарыхтоўваць ў перыяд маладзіка. Час збора раслін залежаў і ад таго, якая частка расліны будзе ўжывацца. Сасновыя почкі, напрыклад, збіралі ў лютым і сакавіку, бярозавыя і тапаліныя – ў сакавіку і красавіку. Плады і семя нарыхтоўвалі пасля таго, як яны цалкам паспеюць. Карані выкопвалі ў канцы летняй пары або восенню, больш рэдка – вясной (напр. валяр'ян). Дадзеная сістэма народных уяўленняў па збору раслін базіравалася на рацыянальных ведах, паколькі восенню ў каранях утрымлівалася найбольшая колькасць актыўных лекавых рэчываў.

На сучасны момант большасць жыхароў Падзвіння сярод тых, хто займаецца нарыхтоўкай дзікарослых траў, як правіла, не прытрымліваюцца жорсткай сістэмы і пэўных часавых межаў пры зборы раслін. Травы збіраюць ў любы вольны час, спасылаючыся на тое, што раней старыя людзі ведалі "правільны" час збору: "Не думала аб этам. Када есць врэмя, тада і збіраю. Старыя людзі знаюць, можа када ета дзействіцельна была – ранкам, ілі наабарот…"[4]

Збіралі як самі расліны, так і іх асобныя часткі – сцябліны, лісце, кветкі, плады і карэнні. Зборам лекавых раслін, або зёлак, пераважна займаліся старыя жанчыны, якія ў сілу свайго ўзросту лічыліся найбольш вопытнымі, "набліжанымі" да мяжы з іншасветам. Сабраным імі зёлкам прадпісвалі значна большую лекавую сілу: "Факцічаскі травы нада збіраць старому чалавеку…Ну стары чалавек штоб, і яны очэнь памагаюць" [5]. Па этнаграфічных звестках М. Федароўскага, ад жаночых хвароб лекавыя расліны павінны былі збіраць дзеці, дзяўчыны альбо старыя жанчыны. Адзначым, што і сярод сучаснага насельніцтва Падзвіння збор дзікарослых раслін з'яўляецца прэрагатывай жанчын сталага веку.

Па матэрыялах апытання насельніцтва аднымі з самых распаўсюджаных траў з'яўляліся: святаяннік (лац. Hypericum, нар. зверабой), дзівасіл (лац. Ínula), падтыннік (лац. Chelidonium, нар. – чыстацел) [Мал. 1], сухацвет (лац. Xerānthemum ānnuum), крываўнік (лац. Achilléa), ліпа [Мал. 2], дуброўка, крапіва, скрыпень (лац. Epilobium), чабор (лац. Thýmus), рамонкі, мацярдушка (лац. Origanum, нар. – душыца), лопух (лац. Arctium), палын, ваўчкі (лац. Bidens) і г.д. Дадзеныя расліны выкарыстоўваліся беларусамі з даўніх часоў, дзякуючы чаму іх лекавыя ўласцівасці не падвяргаюцца сумненню з боку навуковай медыцыны.



**Малюнак 1. – Падтыннік**



**Малюнак 2. – Засушаны ліпавы цвет**

Сучасныя беларускія традыцыі, у тым ліку на тэрыторыі Падзвіння, актыўна працягваюць выкарыстоўваць народныя веды продкаў па выкарыстанні траў не толькі ў харчовай прамысловасці, але і ў касметычнай вытворчасці. Складана ў наш час знайсці нацыянальны касметычны брэнд, які б ў сваім вытворчым працэсе для вырабу прадукцыі не выкарыстоўваў бы дзікарослыя травы. Так, усе з 12 самых вядомых беларускіх касметычных кампаній так ці інакш выкарыстоўваць экстракты раслін для вырабу масел, крэмаў, шампуняў, масак. Сярод папулярных ўжываемых траў – мята, крапіва, рамонак, бэз, ваўчкі, трыпутнік, васілёк, чыстацел, ліпа і інш. Натуральна, што харчовая прамысловасць краіны, ідучы па слядах народных традыцый, на сённяшні дзень працягвае выпуск гарбаты з папулярнымі дзікарослымі травамі – васільком, чаборам, рамонкам, асобна выпускае іван-чай. Шырокую вядомасць у гэтай галіне набылі брэнды гарбаты як "Белтея" і "Калі ласка". Масштаб выкарыстання расліннай сыравіны сапраўды ўражвае, што служыць доказам пераемнасці шматвекавых традыцый ўжывання раслін.

Як мы бачым з вышэйпералічанага, у сучасным беларускім грамадстве традыцыі выкарыстання дзікарослых раслін таксама з'яўляюцца актуальнымі, і маюць вялікія перспектывы. Аднак адзначым, што сучасныя тэндэнцыі выкарыстання расліннага свету набылі новыя формы, у параўнанні з мінулымі часамі. Цяпер веды аб раслінах, якія раней перадаваліся з пакалення ў пакаленне, узнаўляюцца дзякуючы друкаваным крыніцам і сродкам масавай інфармацыі.

Патрэба ў карысных уласцівасцях і моцы дзікарослых раслін дагэтуль захоўваецца у сучасным грамадстве, дзякуючы чаму сёння гэтаму надаецца значная ўвага. Разам з тым, на тэрыторыі Падзвіння і ў іншых гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах актуальным з'яўляецца пытанне павелічэння грамадскага рэзанансу да праблемы захавання расліннага свету і  правільнага прыродакарыстання, у адпаведнасці са шматвекавымі традыцыямі беларусаў. Гэта мусіць быць маркерам высокай экалагічнай культуры грамадства і сродкам умацавання экалагічнай самасвядомасці.

Важную ролю для ўмацавання экалагічнай свядомасці сучасных беларусаў Падзвіння адыгрывае папулярызацыя народных ведаў пра дзікарослыя расліны, а таксама дасведчанасць насельніцтва аб шырокіх перспектывах іх выкарыстання на шматлікіх узроўнях, якія не абмяжоўваюцца харчовай сферай або сферай народнай медыцыны. Так, у дадзеным выпадку сродкам папулярызацыі з'яўляецца сацыяльная рэклама праекта "Размаўляй па-беларуску" і "Смак беларускай мовы" на банэрах у гарадах, якая прадстаўляе назвы найбольш папулярных дзікарослых раслін і ягад на беларускай мове. Дадзены праект не толькі знаёміць з назвамі шырокараспаўсюджаных раслін Беларусі, але і заклікае далучыцца шырокай аўдыторыі да народных традыцый прыродакарыстання. Так, рэклама ўзгадвае такія ягадныя кустарнікі як журавіны, суніцы, ажыны, агрэст, буякі, шыпшына і г.д. [Мал.3]

Адкрыццё ў Беларусі музеяў, прысвечаных раслінам і традыцыям іх выкарыстання, можа служыць выдатным сродкам папулярызацыі традыцыйнай духоўнай культуры, а таксама садзейнічаць павышэнню экалагічнай дасведчанасці ўсіх слаёў насельніцтва. У сваю чаргу, далучэнне да гэтых традыцый садзейнічае фарміраванню этнічнай ідэнтычнасці беларусаў. Прыкладам можа служыць музей водараў травы і раслін у г. Гродна, створанага на базе Гродзенскага эколага-біялагічнага цэнтра дзяцей і моладзі. Галоўная мэта экспазіцыі – пазнаёміць са светам лекавых траў і раслін, правіламі іх збору, ужытку. У музеі прадстаўлена больш за 70 відаў раслін, якія растуць на палях вобласці і ўсёй краіны. Многія вырашчаны на аптэкарскім агародзе эколага-біялагічнага цэнтра. Музей дзеліцца на некалькі зон: кухня, лазня, лекавыя расліны на падваконніку, гербарый. Таксама падрыхтаваныя некалькі відаў араматычнага мыла з натуральных інгрэдыентаў на продаж. Самыя распаўсюджаныя ў музеі расліны: рамонак, шалфей, мацярдушка, крываўнік, піжма, мята. У цэнтры праводзяцца экскурсіі ў форме гульні-пажарожжа. Наведвальнікі даведваюцца аб разнастайнасці лекавых раслін, іх прымяненні ў народнай медыцыне, касметалогіі, кулінарыі, могуць пазнаёміцца з водарамі для лазні і кухні [6]. Адкрыццё такога роду музеяў і стварэнне тэматычных выстаў сведчыць аб тым, што цікавасць насельніцтва да традыцый выкарыстання раслін з часам не толькі не слабее, але нават працягвае расці і ўвасабляецца ў новых формах.




**Малюнак 3. – Дзікарослыя расліны на банэрах беларускай сацыяльнай рэкламы.**

Мяркуем, што падобная ініцыятыва можа мець месца і на тэрыторыі Падзвіння, з мэтай захавання мясцовай традыцыі выкарыстання дзікарослых раслін і ўмацавання экалагічнай самасвядомасці беларусаў. Так, напрыклад, арганізацыя падобнай экспазіцыі цалкам упісваецца ў канцэпцыю Прыродна-экалагічнага музея, філіяла Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Наведвальнікам полацкага музея, па аналогіі з гродненскай экспазіцыяй, можа быць прапанавана ўнікальная магчымасць азнаёміцца з багацейшымі мясцовымі традыцыямі збору і ўжытку раслін.

Важным інструментам умацавання экалагічных паводзінаў беларусаў Падзвіння мусіць стаць і папулярызацыя экалагічных сцежак – экалагічных маршрутаў, якія выгадна прадстаўляюць прыродныя багацці рэгіёна і традыцыі, звязаныя з іх засваеннем, як на айчыннай, так і міжнароднай арэне. Падобныя маршруты актыўна транслююць важнасць захавання ўяўленняў аб раслінных сімвалах як культурнай спадчыны, які перадаецца маладому пакаленню. Падобны вопыт актыўна выкарыстоўваецца ў заходнееўрапейскіх краінах. Мэтай арганізацыі дадзеных маршрутаў з'яўляецца ў першую чаргу знаёмства насельніцтва з мясцовай флорай, і як вынік прыцягненне ўвагі да пытання захавання прыродных багаццяў. Таксама, у рамках далейшага развіцця сеткі экалагічных сцежак магчыма і наладжванне рэгіянальнай інфраструктуры.

Асобай формай папулярызацыі беларускіх народных ведаў аб раслінах можна лічыць арганізацыю мясцовыя святаў і фэстаў, прысвечаных традыцыям выкарыстання раслін. Дзякуючы такім мерапрыемствам адбываецца не толькі аднаўленне народных традыцый выкарыстання дзікарослых раслін, але і перадача досведу падрастаючаму пакаленню. Фэсты зноў жа садзейнічаюць павышэнню экалагічнай дасведчанасці насельніцтва і пашыраюць грамадскі рэзананс у адносінах да захавання як прыродных рэсурсаў, так і нацыянальнай культурнай спадчыны. Так, падобныя мерапрыемствы маюць месца быць у іншых рэгіёнах Беларусі – напрыклад, траўны фэст на Любаншчыне. Няма сумненняў, што традыцыі гісторыка-этнаграфічнага рэгіёну Падзвіння таксама мусяць быць яскрава прадстаўлены.

На думку аўтара, вялікія перспектывы для сучаснай культуры беларусаў, у тым ліку і беларусаў Падзвіння, мае выкарыстанне вобразаў дзікарослых раслін у якасці нацыянальных і лакальных брэндаў. Так, на сённяшні дзень дзікарослыя травы знаходзяць сваё адлюстраванне ў індывідуальнай прадукцыі маладых беларускіх майстроў, якія выкарыстоўваюць іх ў сваіх вырабах у эстэтычных мэтах. Напрыклад, дызайнер Настасся Скалабан, стварае ўнікальныя жаночыя ўпрыгожванні, спалучаючы натуральныя засушаныя кветкі і травы з арганічным шклом. Сама дызайнер тлумачыць выбар дзікарослых раслін для сваёй працы тым, што "расліны захоўваюць моцную энергію і дапамагаюць сваім гаспадарам". Настасся адзначае, што яе заўсёды цікавілі старажытныя веды, асабліва траўніцтва. Веды аб уласцівасцях раслін і традыцыях іх выкарыстання дзяўчына набывае з друкаваных крыніц. [7] Сімволіка раслін выкарыстоўваецца брэндам pollihands для стварэння серыі арнаментаў, напрыклад, арнаменты "Васількі" і "Васількі Марыі". Асноўны элемент ўпрыгожвання - кветкі васілька.

У сучасным жыцці прыкладам паспяховага выкарыстання расліны як беларускага брэнда з’яўляецца менавіта васілёк. Кветка васілька абазначае ў межах краіны з'явы, якія мусяць быць пазначаны як нацыянальныя. Сімвалам нацыянальных авіяліній «Белавія» з'яўляецца васілёк. Сетка рэстаранаў нацыянальнай кухні Беларусі таксама носіць назву "Васількі". Перад Еўрапейскімі гульнямі 2019 года харчовая прамысловасць краіны наладзіла вытворчасць марожанага, якое стала візітнай карткай – блакітнае марозіва рыхтавалі з выкарыстаннем джэму з васількавых пялёсткаў і насення лёну.

Натуральна, што ў кожнага гісторыка-этнаграфічнага рэгіёна Беларусі, у тым ліку і Падзвіння, ёсць магчымасць выбару свайго ўласнага расліннага сімвала-брэнда, які б адрозніваў іх адзін ад аднога і выгадна падкрэсліваў унікальнасць мясцовай традыцыі. Дадзеная тэндэнцыя ў значнай ступені садзейнічала б папулярызацыі традыцыйнай культуры рэгіёна і ўмацаванню экалагічнай самасвядомасці насельніцтва.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Архіў гісторыка-філалагічнага факультэта Полацкага Дзяржаўнага Універсітэта (АГФФПДУ) – Фонд 1. – Воп. 3. – Сп. 1
2. АГФФПДУ – Фонд 1. – Воп. 3. – Сп. 5
3. АГФФПДУ – Фонд 1. – Воп. 3. – Сп.2. – Сш. 2
4. АГФФПДУ – Фонд 1. – Воп. 3. – Сп.2. – Сш. 3
5. Архив Института искусствоведения, этнографии и фольклора им. К.Крапивы (АИИЭФ) – Фонд 6. – Оп. 14. – Д. 214

6. Музей ароматов трав и растений [Электронный ресурс] // Режим доступа: http://museums.by/muzei/muzei-g-grodno-i-grodnenskoy-oblasti/muzey-aromatov-trav-i-rasteniy/. – Дата доступа: 20.06.2021.
7. «Жить за счет ремесла реально». Белоруска показывает, как она создает уникальные украшения ручной работы [Электронный ресурс] // TUT.BY : белорус. портал. – Режим доступа: https://lady.tut.by/news/style/623773.html. – Дата доступа: 11.06.2019.

## PROSPECTS OF MODERN USE OF WILD PLANTS BY BELARUSIANS OF PODVINYE REGION AS A MEANS OF STRENGTHENING ECOLOGICAL SELF-AWARENESS

***Ya. Shevchenko***

*Wild plants have played an important role in the daily life, rituals and ceremonies of Belarusians, including the region of Podvinye. The existing traditions of using wild plants were evidence of the extremely high ecological self-awareness of Belarusians. The current field of use of wild plants of Podvinye continues to be quite wide and, accordingly, emphasizes the need for sustainable nature management, while preserving all the unique traditions inherent in this historical and ethnographic region. Based on the materials of the author's field research and published scientific sources, the prospects of modern use of wild plants by Belarusians of Podvinye as a means of strengthening ecological self-awareness and popularizing this cultural tradition are characterized.*

***Keywords****: wild plants, historical and ethnographic region of Podvinye, rational use of nature, ecological self-awareness.*